*А.І.Бабко*

# ПОШУКІ АДЗІНСТВА АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА І АДМЕТНАГА: КЛАСІЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ І БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Глабалізацыйныя працэсы нясуць у сабе не толькі небяспеку для нацыянальных культур, але і адкрываюць для іх новыя шанцы і магчымасці. Небяспека мусіць успрымацца тут у пэўным сэнсе як шанцы, бо нацыянальныя культуры ставяцца ва ўмовы, у якіх яны павінны раскрыць свой незадзейнічаны яшчэ патэнцыял, дзеля таго каб “выжыць” і паспяхова развівацца. Успрымаць глабалізацыю найперш менавіта з пункту гледжання тых шанцаў, што яна адкрывае, – гэта надзвычай важная перадумова паспяховага вырашэння задачы развіцця нашай культуры і нашай адметнасці ў сучасных глабалізацыйных працэсах.

Відавочна, што вырашэнне гэтай складанай задачы павінна грунтавацца на трывалым светапоглядным і метадалагічным падмурку. У справе яго стварэння істотную ролю можа і павінна адыграць тэарэтычнае засваенне класічнай філасофскай спадчыны. Адзначым, што ў развіцці беларускай культуры рэалізуюцца шмат якія з ідэй, распрацаваных у рамках класічнай філасофіі. Да такіх ідэй належыць і палажэнне аб глыбокім, непарыўным адзінстве агульначалавечага і спецыфічнага, адметнага, індывідуальнага, вытокі якога месцяцца ў пантэістычнай філасофскай плыні, што атрымала глыбокую распрацоўку ў рамках дыялектычнай традыцыі, найперш у творчасці Гегеля.

Гегель даводзіць, што ў жыцці духа асабліва выразна выяўляецца тая заканамернасць, што абсалютная – канкрэтная, рухомая – тоеснасць супрацьлеглых пачаткаў дасягаецца толькі праз разгортванне і пераадоленне іх абсалютнага ўзаемнага выключэння і адмаўлення і, значыць, праз максімальнае самараскрыццё кожнага з іх. Агульначалавечае, субстанцыянальнае, з аднаго боку, і адметнае, індывідуальнае, з іншага, павінны з абсалютнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўнатой раскрыць свае ўнутраныя патэнцыі, прайсці праз супярэчлівае дачыненне адзін да аднаго і знайсці ў лучнасці адно з адным праўдзівую форму свайго самаздзяйснення. Гегель указвае: “Агульны інтарэс духа заключаецца ў тым, каб дайсці да бясконцага ўнутры сябе быцця суб’ектыўнасці, дасягнуць прымірэння праз абсалютную супрацьлегласць” [4, с. 164].

Дадзеная тэарэтычная мадэль (праз супрацьлегласць да глыбокай нераздзельнай тоеснасці, у рамках якой яе моманты не губляюцца, а наадварот, праз сваю лучнасць узбагачаюць адзін аднаго, выходзяць на больш высокую ступень у сваім самаразвіцці) можа разглядацца як у дастатковай ступені адэкватная тым працэсам, што маюць месца ў беларускай культуры, у якой заўжды выразна выяўлялася памкненне да рэалізацыі агульначалавечага пачатку. Узгадаем, што Ігнат Абдзіраловіч спасылаецца на Францыска Скарыну пры ўказанні на гэтую найважнейшую пошукавую задачу беларускага духа [1, с. 9]. А з якой мастацкай сілай выявіў гэты аспект беларускай культуры Алесь Гарун! Якім гарачым і шчырым было яго памкненне да агульначалавечага, да яго здзяйснення не толькі ў грамадскім, але і ў сваім індывідуальным жыцці, сведчыць напісаны ім у 1911 г. верш “Ноч”:

Каб я ўмеў, каб я смеў
Узляцець, паляцець ці разбіцца!
Як сакол, як арол,
Я падняўся б высока страшэнне,
Я б узяў, я б украў
І сабе і другім адпушчэнне [2, с. 46].

Адзначым у дадзенай сувязі, што Алесь Гарун указвае не толькі на фундаментальную значнасць агульначалавечага для нацыянальнага, беларускага. Ён усведамляе таксама каласальную важнасць беларушчыны для агульначалавечага. Так, у вершы, напісаным з нагоды чатырохгадовых угодак “Нашай нівы”, паэт піша:

Дык шануй, беларус, сваю мову –
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ушануюць нас брацця- народы! [2, с. 42]

Беларуская мова (а гэта цела нашай культуры, нашай нацыянальнай ідэі) з’яўляецца не толькі нашым скарбам, яна мае грунтоўнае значэнне і для іншых народаў.

Характэрная для беларускай культуры інтэнцыя гармонічнага яднання агульначалавечага і нацыянальнага, так што нацыянальнае не губляецца ў дадзенай лучнасці, а набывае ў ёй праўдзівую форму свайго існавання і імкнецца разам з тым узбагаціць агульначалавечае і прынесці штосьці сваё ў яго, належыць да найважнейшых фактараў яе самазахавання ва ўмовах глабалізацыі. Сам факт існавання згаданай інтэнцыі і гістарычны досвед, што паўстаў на аснове яе здзяйснення, ствараюць адпаведную культурна-гістарычную традыцыю, што надзвычай важна для дасягнення згаданай мэты (захавання і развіцця беларускай культуры ў сучасных няпростых варунках).

У Гегеля адзінства агульначалавечага і нацыянальнага, як і адзінства ўсіх фундаментальных дыялектычных супрацьлегласцей, спасцігаецца як рухомае і жывое. Філосаф не стамляецца падкрэсліваць дзейсны, жывы характар духа. Крыніцу дадзенай жывасці ён знаходзіць унутры самой духоўнай сферы, у яе самаадрозненні, самараздваенні, якое пераадольваецца, але ў гэтым пераадоленні захоўваецца разам з тым як яго неабходны момант. Адмаўленне, супрацьлегласць, супярэчнасць з’яўляюцца неад’емнымі момантамі прыроды духа, і толькі дзякуючы ім дух выступае як жыццё і дзейнасць. Паколькі ўласцівая яму супярэчлівасць мае абсалютны, фундаментальны характар і даводзіцца ў ім да максімальнай вастрыні [3, с. 26], дык і яе пераадоленне патрабуе ад чалавека і чалавецтва каласальных намаганняў, яе прымірэнне не можа быць адзінкавым актам: яно выступае напачатку як адноснае, частковае, аднабаковае і таму ў самім сабе супярэчлівае. Супярэчнасць паміж яго першапачатковай палавінчатасцю і неабходнасцю канкрэтнай тоеснасці, што паўстае пры гэтым, патрабуе новых высілкаў, скіраваных на рашэнне дадзенай задачы, стымулюе духоўную працу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палажэнне аб жывым, рухомым характары духа, аб яго здольнасці вытрымаць самую вострую супярэчнасць і ператварыць яе ў крыніцу свайго самаразвіцця выяўляецца як у вышэйшай ступені значнае для распрацоўкі канцэпцыі захавання і развіцця беларускай культуры ў сучасных умовах. Супярэчлівая сітуацыя, у якой знаходзілася і знаходзіцца беларуская культура (вялікая ўдзельная вага ў нацыянальнай самасвядомасці беларусаў скажоных яе формаў, складаная сітуацыя з роднай мовай і інш.), павінна стаць падставай для самай інтэнсіўнай працы, якая мусіць мець на мэце пераадоленне ўнутраных і знешніх супярэчнасцей і выхад на прынцыпова новы ўзровень яе самаразвіцця. Неабходна адзначыць, што згаданыя ідэі ўжо былі задзейнічаны ў рамках нашай нацыянальнай традыцыі. Ігнат Абдзіраловіч, даводзячы, што “патрэбна ліючаяся, зьменная, заўсёды адпаведная жыцьцёвым праявам форма” [1, с. 21], што “сапраўднай падставай жыцця можа быць толькі творчасць” [1, с. 26], грунтуе сваю пазіцыю на прынцыпах філасофіі жыцця і на дыялектычных прынцыпах. Пры гэтым ён указвае на іх глыбокую ўзаемасувязь: “Тое, што толькі цяпер пазнаў сучасны філёзоф Бэргсон, казаў 25 вякоў назад Гэракліт Цёмны” [1, с. 19]. У адпаведнасці з глыбокімі філасофскімі ідэямі, выказанымі ў рамках згаданых традыцый, “трэба памятаць, што жыццё цячэ, што душа чалавека не стаіць, што чалавек павінен укладаць сваё жыццё так, як яно развіваецца і ліецца”[1, с. 25]. І памятаць гэта неабходна для таго, каб дзейнічаць, працаваць, жыць у нашай мове і культуры дзеля забеспячэння іх руху, развіцця, бо толькі ў такім выпадку яны будуць жыццяздольнай і захаваецца нават у самых складаных умовах.

Але не толькі пытанне аб суадносінах агульначалавечага і нацыянальнага мае істотнае значэнне пры распрацоўцы канцэпцыі развіцця беларускай культуры ў сучасных умовах. Для рашэння дадзенай задачы надзвычай важным з’яўляецца аналіз праблемы суадносін усеагульнага і індывідуальнага, агульначалавечага і асабістага. Гэтая праблема знаходзілася ў цэнтры ўвагі і прадстаўнікоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусветнай філасофіі, і беларускіх філосафаў. Прадметам вострых дыскусій застаецца ў гэтай сувязі канцэпцыя суадносін агульначалавечага і індывідуальнага, прапанаваная Гегелем. Вялікага нямецкага філосафа папракалі ў ігнараванні прынцыпу суб'ектыўнасці [5, с. 760], але гэта не адпавядае сапраўднаму стану рэчаў. Гегель зыходзіць у сваіх развагах з палажэння аб непарыўным адзінстве суб'екта і аб'екта, індывідуальнага і ўсеагульнага, свабоды і неабходнасці. Гэта адзінства, як мяркуе Гегель, сапраўды здзяйсняецца на аснове ўсеагульнага і субстанцыянальнага, але дадзеная акалічнасць зусім не дапускае грэбаўлівага стаўлення да прынцыпу суб'ектыўнасці. Калі б усё было інакш, дык ці можна было б весці гаворку пра адзінства? Такім чынам, філасофія Гегеля арыентуе духоўныя пошукі чалавека і чалавецтва на такі ўзровень арганізацыі грамадскага жыцця, які характарызуецца глыбокім узаемапрасякненнем усеагульнага і адметнага, індывідуальнага. Менавіта на гэты ідэал арыентуе нас і наша нацыянальная традыцыя. Звернемся да творчасці Ігната Абдзіраловіча, які нацэльвае чалавецтва і беларускі народ на такую арганізацыю грамадства, пры якой сацыяльнае і асабістае выступалі б у гармоніі: "Незалежная творчая адзінка ў творчым, няўзьдзержным адзіначным эгоізмам хаўрусе – ідэал будучыні" [1, с. 39]. Разам з тым неабходна адзначыць, што ў нашай культуры раскрываецца і іншы ў вышэйшай ступені важны бок суадносін усеагульнага і індывідуальнага: успрымання агульначалавечага і нацыянальнага ўзбагачае асобу, узбагачае індывіда, спрыяе ягонай саматворчасці і, значыць, ягонаму творчаму ўкладу ў развіццё культуры, агульначалавечай і нацыянальнай. З вялікай мастацкай пераканальнасцю паказаў гэта Уладзімір Караткевіч у рамане "Каласы пад сярпом тваім" у вобразе Алеся Загорскага.

Такім чынам, палажэнне аб адзінстве агульначалавечага і адметнага, нацыянальнага, індывідуальнага, якое ўзыходзіць да класічнай філасофскай думкі, мае глыбокія карані ў беларускай культурнай традыцыі, яно было выпакутавана свядомымі прадстаўнікамі гэтай традыцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне дадзенай ідэі ў плане распрацоўкі канцэпцыі захавання і развіцця беларускай культуры ва ўмовах глабалізацыі нельга пераацаніць, бо яна нацэльвае наш народ на пошук такіх мадэляў паводзін у стасунках з іншымі народамі, дамінантай якіх з'яўляецца адкрытасць да інтэнсіўнага дыялогу з іншымі народамі, з іншымі культурамі дзеля інтэнсіфікацыі працэсаў, што адбываюцца ў яго ўласнай культурнай прасторы, дзеля ўзбагачэння культуры.


1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І.Абдзіраловіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

2. *Гарун, А.* Выбраныя творы / Алесь Гарун. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с.

3. *Гегель, Г.В.Ф.* Энциклопедия философских наук / Г.В.Ф.Гегель. – М.: Мысль, 1977. – Т. 3. – 471 с.

4. *Гегель, Г.В.Ф.* Философия истории / Г.В.Ф.Гегель // Сочинения / Г.В.Ф.Гегель.– М.; Л.: Соцэкгиз, 1935.– Т. 8. – 470 с.

5. *Рассел, Б.* История западной философии / Б.Рассел.– М.: Изд-во иностр. лит., 1959. – 935 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ